# ПАДПОЛЬНАЯ ГРУПА
# Т. А. ЛАМАНОСЕНКА

**Перыяд дзеяння:**

студзень 1942 г. – снежань 1943 г.

**Месца дзеяння:**

раён вуліцы Авіяцыйнай г. Віцебска

**Колькасць:**

30 чалавек

**Кіраўнікі:**

Ламаносенка Тамара Аляксандраўна

Дзейнічала ў Віцебску са студзеня 1942 г. да снежня 1943 г. Налічвала каля 30 чалавек. Кіраўнік Т. А. Ламаносенка (Барадзіна). Склад групы: бацька Аляксандр Пятровіч, маці Марыя Мікалаеўна, брат Генадзь, сваякі М. А. і С. А. Ізмайлавічы, знаёмыя А. Кананенка, В. І. Лебедзева, Л. А. Мацвеева (Любімава), Н. А. Міранoвіч, У. Ф. Папсуевіч, В. Я. Сакалова і яе муж У. І. Лелаус, К. А. Сцяпанава, Я. П. Фільчанка, Г. І. Худалей, В. В. Худалей (Казлова) і інш.

Для падтрымкі сувязі з групай, аператыўнай дастаўкі разведданых, а ў горад – лістовак, газет і дыверсійнага матэрыялу ў групу былі ўключаны некалькі разведчыкаў і сувязных партызанскай брыгады «Аляксея» (А. Ф. Данукалава) і армейскай разведгрупы П. В. Буткевіча. Сувязнымі і разведчыкамі былі А. С. Кіташова, Я. Я. Калабанава, В. М. Кульбеева, яе бацька Мікалай Лявонавіч і маці Ірына Дзмітрыеўна Кульбеевы, В. І. Лебедзева, Г. М. Рашэўская, К. Н. Ціхош. Член групы К. Д. Сямёнава выконвала заданні падпольных груп У. А. Казлоўскага і І. А. Бекішава.

Падпольшчыкі распаўсюджвалі газеты і лістоўкі, збіралі інфармацыю ваеннага характару і накіроўвалі яе ў партызанскую брыгаду «Аляксея», пазней – у Віцебскі падпольны гарком КП(б)Б. На сувязь да партызан часта хадзіла 16-гадовая падпольшчыца

Калабанава, якая дастаўляла ў горад міны, узрыўчатку, удзельнічала ў дыверсіях на чыгунцы. Увосень 1943 г. Мацвеева, якая працавала на аэрадроме, разам з Калабанавай арганізавалі ўцёкі савецкіх ваеннапалонных у партызанскую брыгаду «Аляксея».

Члены падпольнай групы ўдзельнічалі ў аперацыі брыгады па разгроме варожага гарнізона ў маёнтку Білёва (за 3 км ад Віцебска). У барацьбе з акупантамі загінулі Я. Я. Калабанава, А. Кананенка, В. І. Лебедзева, У. Ф. Папсуевіч, К. Д. Сямёнава.

Дзяржаўныя ўзнагароды атрымалі 9 чалавек, у тым ліку кіраўнік групы – ордэн Чырвонай Зоркі.

**ЛІТАРАТУРА**

1. **Дарафеенка, Н. І.** Падпольная група Т. А. Ламаносенка / Н. І. Дарафеенка // Памяць: Віцебск : гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі : у 2 кн. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.] ; склад. А. І. Мацяюн ; маст. Э. Э. Жакевіч. – Мінск, 2002. – Кн. 1. – С. 489–490.

2. **Подпольная** группа Ломоносенко Т. А. // Витебск : энцикл. справочник / редкол.: И. П. Шамякин (гл. ред.) [и др.]. – Минск, 1988. – С. 290.